ПЛЕНУМ ЦК КПСС

12 і 13 снежня 1966 года ў Крамлі праходзіў Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.

Пленум ЦК абмеркаваў даклад Генеральнага сакратара ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжнева «Аб міжнароднай палітыцы СССР і барацьбе КПСС за згуртаванасць камуністычнага руху».

Пленум ЦК аднагалосна прыняў пастанову «Аб міжнароднай палітыцы СССР і барацьбе КПСС за згуртаванасць камуністычнага руху».

Пленум ЦК заслухаў даклады намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР, старшыні Дзяржплана СССР тав. Н. К. Байбакова «Аб праекце Дзяржаўнага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1967 год» і міністра фінансаў СССР тав. В. Ф. Гарбузава «Аб праекце Дзяржаўнага бюджэту СССР на 1967 год».

Па гэтых пытаннях Пленум ЦК прыняў адпаведную пастанову.

Пленум выбраў тав. М. С. Саломенцава сакратаром ЦК КПСС.



Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 38 (649) Пятніца, 16 снежня 1966 года Год выдання XX. Цана 2 кап.

ВІТАЕМ СТУДЭНЦКУЮ БУДАЎНІЧУЮ АРМІЮ

РАБОТА Першага Усесаюзнага злёту студэнцкіх будаўнічых атрадаў у Крамлёўскім Палацы з'ездаў выклікала вялікую цікавасць у калектыва нашага універсітэта. І гэта невыпадкова. У ліку 15 тысяч удзельнікаў беларускага студэнцкага працоўнага семестра былі сотні нашых пасланцоў. На цалінныя будоўлі ад універсітэта выязджала 385 студэнтаў, 6 атрадаў працавала на будоўлях сваёй рэспублікі, 90 чалавек на лесасплавах Цюменскай вобласці, 22 удзельнічала ў будаўніцтве Ташкента, 30 — у Чэхаславакіі.

Нямала яскравых старонак у гісторыю Усесаюзнага працоўнага студэнцкага семестра запісалі нашы атрады «Аэліта», «Брыганціна», «Грэнада», «Вікторыя», «Зубронак», «Феміда» і іншыя.

Аб некаторых з іх сёння мы расказваем на чацвёртай старонцы, а на гэтым здымку вы бачыце групу нядаўна ўзнагароджаных медалямі нашых «цаліннікаў».

МАТЭМАТЫКІ СЯБРУЮЦЬ З ФІЛАСОФІЯЙ

Шосты год у вылічальным цэнтры БДУ працуе семінар па вывучэнню марксісцка-ленінскай філасофіі. Інжынеры—фізікі, матэматыкі пад кіраўніцтвам дацэнта А. Кляўчэні старанна і з вялікай зацікаўленасцю вывучаюць дыялектычны матэрыялізм з улікам сваёй прафесіянальнай спецыфікі. Напрыклад, у мінулым годзе вывучаны такія тэмы, як: «Агульная заканамернасць працэсаў пераапрацоўкі інфармацыі і ўпраўлення», «Структура чалавечага мозгу і структура электроннай машыны», «Кібернетыка на службе камунізма». Не менш цікавыя філасофскія праблемы вывучаюцца і сёлета. Іх назвы гавораць самі за сябе: «Аналіз і сінтэз», «Мадэляванне як метад пазнання», «Доказ і аправяржэнне», «Аксіёматычны метад пабудавання навуковых ведаў» і г. д. На гэтым тыдні [у панядзелак] адбыліся чарговыя заняткі. Спачатку прапагандыст дацэнт А. Кляўчэня зрабіў кароткі уступ. Ён прывёў шматлікія і цікавыя выказванні вядомых філосафаў аб ролі і сіле чалавечага розуму ў працэсе пазнання, а таксама ахарактарызаваў ролю аснаўных метадаў навуковага пазнання.

Затым былі заслуханы два змястоўныя даклады А. Вавілавай і Я. Кавалевіч па тэме «Аналіз і сінтэз».

Свабодна валодаючы матэрыялам, А. Вавілава галоўную ўвагу ўдзяліла разгляду адзінства аналізу і сінтэзу ў працэсе пазнання.

Такім жа глыбокім быў даклад і Я. Кавалевіч. Але Яўгенія Фёдараўна ўдзяліла галоўную ўвагу таму, як К. Маркс і Ул. І. Ленін практычна карысталіся метадам аналізу і сінтэзу ў сваёй навуковай рабоце.

Змястоўныя даклады выклікалі зацікаўленасць. Адбылася творчая дыскусія. Слухач І. Дулінец папрасіў дакладчыкаў з пункту гледжання пазнання вытлумачыць пенінскае вызначэнне прафсаюзаў. У спрэчку педагагічна ўступіў прапагандыст. Ён дапамог правільна высветліць гэтае і іншыя пытанні.

Філасофскі семінар закончыўся падагульненнем прапагандыста. А. С. Кляўчэня ўхваліў станоўчыя бакі дакладаў і зрабіў практычныя заўвагі, а таксама дапоўніў адказы выступаючых на пастаўленыя пытанні.

Ход семінара ярка сведчыў аб сяброўстве матэматыкаў з марксісцка-ленінскай філасофіяй, аб тым, што палітычная вучоба для работнікаў вылічальнага цэнтра прыносіць канкрэтную практычную карысць.

Ул. КУЛАЖАНКА.

Падрыхтоўка да сесіі на хімічным факультэце спалучаецца з дзейснымі практычнымі заняткамі, якія дапамагаюць замацоўваць веды, глыбей пранікаць у таямніцы сваёй навукі. Наш карэспандэнт А. Кадзет сфатаграфаваў студэнтаў першага курса Юрыя Афанасьева і Святлану Галубіцкую на практычных занятках па арганічнай хіміі.

НАРОДНЫ ПЯСНЯР

Нядаўна грамадскасць нашай рэспублікі шырока адзначала 75-годдзе з дня нараджэння выдатнага паэта Беларусі Максіма Багдановіча. З гэтага выпадку цікавы вечар, прысвечаны раданачальніку беларускай паэзіі, адбыўся ў гуманітарным корпусе нашага універсітэта. Арганізатар яго — Саюз пісьменнікаў БССР.

З уступным словам на вечары выступіў Максім Танк. Дацэнт кафедры беларускай літаратуры БДУ паэт А. Лойка спыніўся на характарыстыцы жыцця і творчага шляху Багдановіча. Жадаючых выступіць, спамянуць добрым словам народнага песняра было вельмі многа. Беларускія паэты Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, Максім Лужанін і многія іншыя прачыталі натхнёныя вершы, аддаючы гэтым самым глыбокую павагу вечнаму і жывому слову Багдановіча.

СЛОВА СПРАВАЙ ВЯНЧАЕЦЦА

Абарона дыпломнай — адказная пара для выпускніка. Менавіта, тут правяраецца, на колькі кваліфікавана ён падрыхтаваны для практычнай дзейнасці на вытворчасці, ці навучыўся ён свае тэарэтычныя веды ўкараняць у практыку.

Калі прасачыць, як абаранялі дыпломныя працы студэнты-матэматыкі за апошнія два дні, то можна пераканацца ў тым, што гэты факультэт рыхтуе здольных спецыялістаў. З чатырнаццаці дыпламантаў усё абаранілі свае працы на «выдатна». Гэта цудоўны дэбют матэматыкаў. Акрамя таго, дзесяць прац будзе надрукавана ў навуковых часопісах. Асабліва глыбокія веды паказаў А. Самусенка. Ён спецыялізуецца па вылічальнай матэматыцы. Тэма яго працы «Сходнасць і ацэнкі хібнасці метада інтэгральных суадносін пры рашэнні задач Гурса». Складаная тэма дыпломнай і ў А. Макаранка — «Некаторыя павярхоўнасці ў прасторы Мінкоўскага». Тэмы, як бачыце, складаныя, але пяцікурснікі выдатна справіліся з імі. Ці не вынік гэта напружанай вучобы ва універсітэце на працягу пяці год, плён самаадданай працы нашых выкладчыкаў? Так, бязумоўна, так. Характэрна, што ўсе чатырнаццаць дыпламантаў актыўна ўдзельнічалі ў навуковых гуртках, выступалі на канферэнцыях.

— Я глыбока ўпэўнены, — адзначыў дэкан матэматычнага факультэта А. А. Гусак, — што гэта выдатныя спецыялісты для вытворчасці. Уяўляеце, у нас, цяпер двайная радасць: па-першае, усе чатырнаццаць атрымалі выдатныя адзнакі, а па-другое, у бліжэйшы час зноў сустрэнемся са сваімі выпускнікамі, праўда, ўжо на старонках навуковых часопісаў. Як гэта прыемна для нас, усіх выкладчыкаў факультэта!

Ю. АГАРАДНІЧЭНКА.

СЁННЯ Ў НАС У ГАСЦЯХ — студэнты трэцяга курса вячэрняга аддзялення, будучыя журналісты. У якасці практыкі яны вырашылі расказаць аб вучобе, набалеўшых праблемах і цяжкасцях вячэрнікаў. Вячэрняе навучанне займае важнае месца ў нашым універсітэце. Дастаткова сказаць, што ім цяпер ахоплена каля трох тысяч чалавек. Гэта рабочыя, служачыя, якія спалучаюць вучобу з працай на вытворчасці. Не кожнаму ўдаецца паспяваць, але большасць добрасумленна адносіцца да сваіх абавязкаў, нягледзячы на цяжкасці, імкнецца атрымаць вышэйшую адукацыю. Аб гэтым ідзе гутарка ў друкуемых артыкулах. Фотаздымкі выкананы тт. Сомунам і Маскацельнікавым. Матэрыялы гэтых старонак падрыхтаваны пад кіраўніцтвам выкладчыка кафедры тэорыі і практыкі савецкага друку Анатоля Вікенцьевіча Балаша.

ІХ ДЭВІЗ—ПРАЦАВАЦЬ І ВУЧЫЦЦА

У дэканаце геолага-геаграфічнага факультэта нас прынялі гасцінна. Сакратар вячэрняга аддзялення Таіса Іванаўна ахвотна адказвае на нашы пытанні, якія датычацца жыцця і вучобы студэнтаў.

Многія з іх з'яўляюцца выдатнікамі, гаворыць яна. Вось І. Гужаў — лётчык грамадзянскага паветранага флоту. Лётае другім пілотам на «ІЛ-14». Геаграфію вывучае не толькі на занятках у аўдыторыі, але і на борце самалёта. Ён паспяхова вучыцца на трэцім курсе.

С. Яснова таксама трэцякурсніца. Яна працуе музыкальным кіраўніком у дзіцячым садзе. Добра спявае. У студэнткі мала вольнага часу, але ўсё ж у калектыве мастацкай самадзейнасці факультэта яе можна бачыць вельмі часта.

З адкрытым захапленнем слухалі мы расказ аб студэнце Б. Паглазаве. Працуючы начальнікам вышукальнай экспедыцыі Белпрампраекта, ён з'яўляецца адным з лепшых студэнтаў на факультэце. Пад яго кіраўніцтвам вядзе навукова-даследчую работу многа спецыялістаў з геалагічнай адукацыяй.

Аб поспехах вячэрнікаў гаворыць хоць бы такі факт. У мінулым годзе з 17 студэнтаў гэтага аддзялення два атрымалі дыпломы выдатніка, а на дзённым гэтага гонару быў удастоены толькі адзін чалавек.

Пасля гутарка ідзе аб групах. Якая ж група лепшая! Каб вырашыць гэтую задачу, улічваем наведванне лекцый і паспяховасць. Пасля кароткага абмеркавання перавагу аддаем другой групе трэцяга курса.

Ж. Равінская, студэнтка гэтай групы, называе імёны сваіх сяброў—лепшых у вучобе: І. Рачкоўскага, Е. Накса, А. Луніна, А. Семярычэнка, Л. Шотта, І. Радзюк і іншых. Група згуртаваная, дружная. Клопаты аднаго аб другім спалучаюцца з патрабавальнасцю і чулымі адносінамі. Лепшыя студэнты пастаянна аказваюць дапамогу слаба паспяваючым. Дзякуючы гэтаму, у групе амаль не бывае запазычанняў. Тут стала законам: адзін за ўсіх — і ўсе за аднаго.

Аднойчы перад пачаткам заняткаў, калі ўсе студэнты знаходзіліся на сваіх месцах, у групе трывожна загаварылі аб тым, што захварэў выкладчык геадэзіі А. Г. Мядзведзеў. За час вучобы студэнты палюбілі выдатнага педагога, і вестка аб яго хваробе ўсхвалявала іх да глыбіні душы. Яны ўсёй групай адправіліся да яго на кватэру.

Наша размова зацягнулася. Ужо закончыліся заняткі. Усе спяшаюцца дадому. Мы таксама выходзім і выносім з сабой часцінку таго добрага, што ўбачылі і пачулі тут. Добрае ўражанне доўга не пакідае нас.

В. КАЧАН.

Вялікая група студэнтаў-вячэрнікаў у гэтым годзе закончыць курс навучання ва універсітэце. І сярод іх супрацоўнік БелГІІЗа шасцікурснік геолага-геаграфічнага факультэта Іван Хрусталін, якога вы бачыце на сваім рабочым месцы.



Карысна прачытаць

ПАДМАН ВЫКЛАДЧЫКА ЁСЦЬ САМАПАДМАН

«Важна выхаваць у вячэрнікаў і завочнікаў пачуццё самадысцыпліны, пачуццё неабходнасці самастойнага выканання вучэбных заданняў, у адваротным выпадку, аб ні якай вучобе гаворкі не можа быць, таму што падман выкладчыка ёсць самападман». Гэтая вытрымка ўзята з брашуры «Пытанні вячэрняга і завочнага навучання», якая нядаўна вышла ў выдавецтве «Вышэйшая школа» у Мінску. Яна складзена з дакладаў прафесараў і выкладчыкаў нашага універсітэта, з якімі яны выступілі на метадычнай канферэнцыі.

Брашура адкрываецца артыкулам прарэктара А. Я. Малышава «Шляхі ўдасканалення вучэбнага працэса на вячэрнім факультэце». Даючы глыбокі аналіз поспехам і недахопам гэтай формы навучання ва універсітэце, аўтар паставіў перад студэнтамі і выкладчыкамі шмат новых задач. Многа цікавых вывадаў і назіранняў у выступленні кандыдата геаграфічных навук В. А. Жучкевіча: «Аб унутранай выхаваўчай рабоце са студэнтамі-вячэрнікамі» і «Аб праграміраваным навучанні на вячэрнім факультэце». Прафесар Л. М. Шнеерсон дзеліцца сваім вопытам методыкі правядзення практычных заняткаў па новай гісторыі на вячэрнім факультэце; аб асаблівасцях работы з вячэрнікамі расказваюць у сваіх артыкулах кандыдат медыцынскіх навук К. І. Грышан (па біялогіі), М. А. Паўленка, Я. М. Камароўскі, Н. І. Рамашка (па філалагічных дысцыплінах) і іншыя.

Выданне гэтага зборніка — сведчанне вялікай увагі рэктарата і кафедраў універсітэта да гэтых форм навучання, якія яшчэ не сталі высокаэфектыўнымі.

І ЛЯЦЯЦЬ ДАКЛАДНЫЯ Ў ДЭКАНАТЫ...

На вячэрніх вуліцах нашага горада мнагалюдна, асабліва цяпер. Спяшаюцца людзі дадому, у кіно, у бібліятэку, у магазін... Многія накіраўваюцца ва універсітэт. Фізічны і матэматычны, юрыдычны і геаграфічны і іншыя факультэты чакаюць сваіх вячэрніх слухачоў. Гасцінна адкрываюцца дзверы для усіх — калі ласка, паглыбляй свае веды. Але спяшаюцца чамусьці тут не ўсе студэнты. Калі прапанаваць прапусціўшаму заняткі даць тлумачэнне прычыны, то можна пачуць самыя розныя адказы: быў на прафсаюзным сходзе цэха, дзіця захварэла, дрэннае самаадчуванне, быў не падрыхтаваны да семінара. Апошняя прычына мне здаецца самай аб'ектыўнай. «Не падрыхтаваўся, не паспеў, мала было часу». Вядома, часу вельмі мала: серада, субота, нядзеля. А колькі вячэрнікаў прыходзіць у гэты час у вучэбныя кабінеты, чытальні універсітэта? Мала, мізэрна мала.

Вядома, што вольны час кожнаму хочацца выкарыстаць для сябе, свайго дома, сям'і. Якое ж выйсце? Хіба іншыя студэнты, што наведваюць рэгулярна лекцыі, семінары, адмаўляюцца ад кіно, тэатра, спатканняў? Вядома, не. І ў іх усё выходзіць выдатна. Ці не арганізаваць нам яшчэ пры вячэрніх факультэтах вячэрнюю школу па абмену вопытам?..

Калі прасачыць спісы наведвання вячэрнікамі заняткаў, то больш за ўсё пропускаў падае на той дзень, калі ў раскладзе намечаны практычныя заняткі. Гэтая акалічнасць характэрна для ўсіх факультэтаў. І ляцяць дакладныя ў дэканаты, а ўслед за імі тлумачальныя «граматы», накшталт такіх, якую напісаў студэнт другога курса фізфака Юўчанка: «Шэсць практычных па гісторыі КПСС я прапусціў таму, што два заняткі я патраціў для здачы «хвастоў», два хварэў, два працаваў». Чытаеш гэта і становіцца неяк ніякавата на душы. Чаму чалавек так несур'ёзна адносіцца да вучобы?

Іншыя прыкрываюцца словам «працаваў». На фізфаку так адказвае не толькі Юўчанка, а на матфаку студэнт пятага курса Гарэлік...

Дэканаты заўсёды ідуць студэнтам насустрач, дапамагаюць ім. Вось прыклад. Студэнт-дыпломнік фізфака Граменка звярнуўся у дэканат за дапамогай. Справа ў тым, што яму цяпер неабходна прысутнічаць на ўсіх практычных заняткох, і таму працаваць трэба толькі ў адну змену. Дэканат накіраваў пісьмо на завод. Просьбу задаволілі. І такіх прыкладаў шмат.

Самае прыемнае ўражанне ў нас засталося ад праверкі наведвання заняткаў студэнтамі геолага—геаграфічнага факультэта. Тут вельмі уважліва адносяцца да ўсіх. Няма на факультэце ніводнага студэнта, аб пропусках якога было б невядома сакратару Таісе Іванаўне.

Мы разглядзелі не ўсе абаронныя «шчыты» вячэрнікаў. Дый ці патрэбна гэта? Кожны ведае, што частыя пропускі заняткаў» — гэта прамая дарожка да двойкі ў залікоўцы.

Сёння не пайшоў на лекцыю, заўтра на семінар — і кніжкі, і вучоба адсоўваецца недзе на іншы, другарадны план. Так паступова людзі трацяць самакантроль, не заўважаюць, як становяцца непатрабавальнымі да сябе. А гэта, як кажуць, ужо хвароба. Трэба лячыцца.

В. СТРЫЖЭЎСКІ.

ЯК ТРАПІЦЬ У «ЧЫТАЛКУ»?

На гэтае пытанне не адкажаш не толькі таму, што перш, чым сядзеш займацца, добра напрацуешся, і не так лёгка будзе запамятаць складаныя алгебраічныя формулы. У нашых чытальнях на працягу семестра вельмі цяжка знайсці патрэбную літаратуру. І не таму, што яе яшчэ недастаткова. Проста, калі выдзяляюць на групу падручнікі, аб вячэрніках забываюцца. Але ім, як нікому больш, неабходна мець хоць бы на траіх адну кніжку. Дома заўсёды можна «выкраіць» час-другі для самастойнай вучобы.

Гавораць, што вячэрнікі працавіты народ. Але як вячэрніку дастаецца поспех, аб гэтым многія не задумваюцца. Не сакрэт, што на рабоце не заўсёды добразычліва адносяцца, а ва універсітэце турбуюць за спазненні і пропускі заняткаў.

Вось чаму скардзяцца і матэматыкі, і філолагі, і фізікі...

Кафедрам трэба не забывацца пра вячэрнікаў. Тое, што студэнт можа зрабіць за адну нядзелю і суботу, цяжка падлічыць. А калі падлічыш, становіцца зразумелым, як гэтага мала.

Суботу? Але ж у суботу кабінеты пустуюць. Можа таму, што працоўны тыдзень накладвае свой адбітак і проста нялёгка пераключыцца на інтэгралы і замежную мову пасля напружанай работы. Неабходна падумаць, каб вячэрнікі мелі магчымасць займацца ў кабінетах і лабараторыях і ў нядзельны дзень. Гэта агульная просьба вячэрнікаў.

Возьмем да прыкладу кабінет англійскай мовы. Працуе ён з 11 да 18 гадзін. Не дзіўна, што вячэрнік тут рэдкі госць. А калі ты нават і трапіш у другую змену, то прачакаеш лабаранта хвілін трыццаць, а то і больш. Кабінет друку зусім невядома, калі працуе. Тут цябе часта сустракае замок. Трэба пабудаваць работу кабінетаў з улікам запатрабаванняў і вячэрняга навучання. Было б мэтазгодным, каб кабінеты якую-небудзь трэцюю частку вучэбнай літаратуры маглі выдаваць вячэрнікам на дзень-два дадому. Інакш — колькі гарадскіх чытальняў прыходзіцца вячэрніку наведаць за адзін дзень у пошуках патрэбнага вучэбніка. А калі і знойдзеш, дык высвятляецца, што няма дзе сесьці. Вось так з году ў год вячэрніку прыходзіцца рабіць штонядзельны «крос» у пошуках месца ці кніжкі ў чытальні. Вельмі складаная дарожка гэтага кросу. Ці нельга было б яе скараціць і выпраміць?

Я. ГУДАНІС.



КАЛІ АДНА КНІГА НА ДВАІХ...

ЧЭМПІЁНКА КРАІНЫ

Вось ужо некалькі год імя і партрэт гэтай дзяўчыны не сходзяць са старонак спартыўных і іншых газет. Яна, нібы жартуючы, заваёўвае адзін гучны тытул за другім. Толькі ў мінулым годзе Людміла Зданюк стала ўладальніцай Кубка рэспублікі і была другім прызёрам у розыгрышы Кубка краіны, выйграла чэмпіёнскае званне на двух Усесаюзных спартакіядах: школьнай і прафсаюзнай. А перад гэтымі спаборніцтвамі яна выйграла на аналагічных спартакіядах рэспублікі. Нездарма жартавалі часам некаторыя журналісты, што гімнастка шмат дала работы фотарэпарцёрам і карэспандэнтам.

А ў гэтым годзе Люда стала чэмпіёнкай краіны.

Вы часта сустракаеце гэтую дзяўчыну на вуліцах, у тэатрах Мінска. Людміла Зданюк — наша студэнтка. Чэмпіёнка СССР, яна вучыцца на першым курсе вячэрняга аддзялення журналістыкі. Упарта авалодвае спартсменка ведамі. Пройдзе яшчэ некалькі год і мы ўбачым подпіс чэмпіёнкі краіны пад матэрыяламі аб чэмпіёнах.

У. ГЛОД.

Паглядзіце на гэтых юнакоў і дзяўчат. Яны толькі што закончылі свой працоўны дзень, час і адпачыць. Але... клічуць універсітэцкія аўдыторыі. Тут, на лекцыях і практычных занятках яны вывучаюць гісторыю партыі і фізіку, палітэканомію і матэматыку, філасофію і права, літаратуру і хімію... Што ж наша рэчаіснасць цяпер патрабуе ад усіх працаўнікоў высокай кваліфікаванасці, ведання «сакрэтаў» не толькі вытворчасці, але і навукі.



ДАРАГОЕ ІМЯ—ВЫКЛАДЧЫК

Вадзім Васільевіч Свірыдаў нядаўна вярнуўся з паездкі па Югаславіі, дзе правёў два тыдні. Там, у Люблянскім універсітэце, ён тры разы выступіў з навуковымі дакладамі аб працэсах, якія працякаюць у цвёрдых рэчывах пры дзеянні іёнізіруючых вылучэнняў, а таксама знаёміўся з навуковай працай сваіх калег.

Два тыдні, вядома, тэрмін не такі і вялікі. Але для многіх студэнтаў вячэрняга, і стацыянарнага аддзяленняў хімфака гэты час паказаўся працяглым. З вялікай нецярплівасцю чакалі любімага выкладчыка не толькі студэнты чацвёртага і пятага курсаў, але і першакурснікі, якія ўжо паспелі палюбіць Вадзіма Васільевіча за простыя, даходлівыя і ў той жа час цікавыя і глыбокія лекцыі. Цяпер ён чытае першакурснікам лекцыйны курс па хіміі. А студэнтам старэйшых курсаў — спецыяльны курс па выбраных раздзелах неарганічнай хіміі. Але, бадай, больш за ўсіх чакаў прыезда дацэнта студэнт вячэрняга аддзялення Лёня Рогач. Ён цяпер піша дыпломную працу па тэме: «Інфрачырвоныя спектры гідравокісаў металаў». У гэтым месяцы Лёня будзе датэрмінова абараняць дыпломную.

Пад кіраўніцтвам камуніста В. В. Свірыдава піша дысертацыю Георгій Шчукін, які ў мінулым годзе закончыў вячэрняе аддзяленне хімфака. Гэта мы даведаліся ад іншых, аб сабе Вадзім Васільевіч не любіць гаварыць.

У яго працоўным кабінеце заўсёды многалюдна.

— У Вадзіма Васільевіча,—расказваюць на факультэце, — можна заўсёды атрымаць кваліфікаваную кансультацыю па любому навуковаму пытанню хіміі, аб самых апошніх яе дасягненнях і адкрыццях. В. В. Свірыдаў вельмі многа свайго часу аддае навуковым працам студэнтаў, іх вучобе. Перад сесіяй яго можна знайсці ва універсітэце і зранку і вечарам. Кансультацыі дацэнта перад экзаменам захапляючыя, поўныя. Таму, відаць, і поспехі студэнтаў па яго дысцыпліне заўсёды добрыя.

— Мы проста шчаслівыя, што вучымся і працуем побач з такім выдатным чалавекам, як Вадзім Васільевіч, — гаворыць студэнтка Гвідона Шаўчэнка. Яна выказала думку многіх.

У 1952 годзе Свірыдаў закончыў універсітэт, а ў 1955, пасля заканчэння асірантуры, абараніў кандыдацкую дысертацыю і стаў працаваць выкладчыкам кафедры неарганічнай хіміі. Цяпер ён узначальвае яе. Пяру дацэнта належыць шмат навуковых прац. Нядаўна выйшла з друку яго цікавая манаграфія «Фотахімія і радыяцыйная хімія», а таксама «Зборнік пытанняў і хімічных практыкаванняў па неарганічнай хіміі».

Многія былыя члены навуковага гуртка, якім кіруе В. В. Свірыдаў, ужо закончылі аспірантуру, працуюць у вышэйных навучальных установах рэспублікі.

Можна яшчэ многа расказваць пра Вадзіма Васільевіча—і аб яго актыўным удзеле ў лекцыйнай прапагандзе, у грамадскай дзейнасці. Ён усюды паспявае.

Набліжаецца сесія. Усё часцей і часцей звяртаюцца студэнты да любімага выкладчыка. І ён кожнаму дапамагае, дае добрую параду, неабходную кансультацыю.

Т. ВАРАБ'ЁВА.



Нэлю Кобец і Таню Васілец вабяць прыродазнаўчыя навукі. Шмат новага, цікавага даведаліся яны ва універсітэце. Таня (справа) займаецца ўжо на пятым курсе хімічнага факультэта. А Нэля — будучы фізік. Хутка разам са сваімі сябрамі яна будзе здаваць зімовую сесію на трэцім курсе. Часу на падрыхтоўку мала — трэба добра выканаць заданні на вытворчасці, паспець на лекцыі, дый і дома розных клопатаў хапае. Таму дзяўчатамі выкарыстоўваецца кожная вольная хвіліна, і не здзіўляйцеся, калі вы іх убачыце з разгорнутай кніжкай у трамваі ці тралейбусе.

СЕСІЯ ПАДВЯДЗЕ ВЫНІКІ

Палітэканомія — адна з самых складаных гуманітарных навук. Авалодаць ёй не так проста. Над курсам трэба старанна і паўсядзённа працаваць. Але калі хаця і сістэматычна працаваць, некаторыя тэмы для студэнтаў прадстаўляюць моцны «арэшак». Тады на дапамогу прыходзіць выкладчык. Як правіла, па «цяжкіх» пытаннях праводзяцца семінары. Мне нядаўна прышлося прысутнічаць на адным з практычных заняткаў.

Матэматыкі трэцяга курса старанна падрыхтаваліся да семінара. Змястоўна выступілі стараста групы Фальковіч, студэнты Белянкевіч, Сяргеева. Добрымі былі адказы і іншых. Асабліва мне падабалася трапнае выкарыстанне канкрэтных прыкладаў з развіцця сучаснай эканомікі ў нашай краіне. Але некаторыя студэнты збіваліся на павярхоўнасць, адыходзілі ад галоўнага і выкладчыку прыходзілася іх папраўляць, дапамагаць, каб кожнае пытанне было разабрана дэталёва.

Так, вопыт самастойнага разважання па тэарэтычных пытаннях прыходзіць не адразу. Патрэбна старанная праца над першакрыніцамі, падручнікамі. І добра тое, што большасць студэнтаў групы глыбока авалодвае новымі матэрыяламі.

Сесія падвядзе вынік настойлівай працы. Яна не страшная таму, хто паўсядзённа сябруе з кнігамі.

Г. ГУБАР.

ПРАБЛЕМЫ... ПРАБЛЕМЫ...

Вядома, у кожнага існуе шмат праблем. Малых і вялікіх, вырашаных і нявырашаных. Асабліва многа іх у вячэрнікаў. Трэба паспець на працу, выканаць вытворчае заданне, паслухаць лекцыі, папрацаваць над кнігай... Так мала часу, а ўсюды трэба паспець. Нездарма кажуць, што студэнт усё «выцягне». Нават з першага разу можа здаць «хвост», жартуе у адказ на наша пытанне аб паспяховасці студэнтаў вячэрняга аддзялення дэкан біялагічнага факультэта П. Р. Пятровіч.

У студэнтаў факультэта няма акадэмічнай запазычанасці. Здавалася, што і поспехі павінны быць добрымі, але аказалася зусім не так. Павел Рыгоравіч расказвае аб вялікай вытворчай і вучэбнай нагрузцы студэнтаў.

— Недзе вячэрнік аддае не ўсё, — разважае дэкан, — працаваць адзінаццаць гадзін не кожны здолее. Таму некаторыя ці на рабоце, ці на лекцыі проста адсежваюцца.

— Якую карысць прыносіць зубны ўрач на пасадзе кухара, такую прыносіць біёлаг, калі ён працуе ў магазіне, — адказвае нам дэкан.

Паўстае пытанне, навошта такой спецыяльнасці, па якой працуеш на вытворчасці, а вячэрнікі таксама, як і студэнты стацыянара, размяркоўваліся на працу. Гэта намнога скараціла б такія пасады, як, скажам, прадаўца-гісторыка, цесляра-біёлага...

Выпускнікі, якія працуюць па спецыяльнасці, выбранай ва універсітэце, маюць права павышэння ў пасадзе. Але што рабіць з тымі, якія працуюць у магазінах, бальніцах, сталовых. Што тут агульнага з біялогіяй?

займае месца ў вышэйшай навучальнай установе такі «гора-студэнт»? Гэта таксама праблема...

Відавочна, было б на многа лепш, каб прыём на вячэрняе аддзяленне праводзіўся па

Дэкан матэматычнага факультэта А. А. Гусак дапаўняе П. Р. Пятровіча:

— Калі на дзённым аддзяленні сто гадзін аналітычнай геаметрыі, то і на вячэрнім іх не менш. Амаль 60 працэнтаў усіх заняткаў траціцца на практычную форму навучання. Прыродазнаўчыя навукі патрабуюць вялікай напружанай працы, многа часу, а яго, нажаль, у вячэрнікаў няма. Чарговая праблема — праблема часу...

А вось што сказала нам студэнтка-вячэрніца пятага курса філалагічнага факультэта Зіна Бондарава:

— Працавала пяць год у дзіцячым садзе, з іх тры гады абівала парогі ў пошуках работы ў школе. Нарэшце, шчасце ўсміхнулася мне: уладкавалася на працу старшай піянерважатай. А пасля і першыя ўрокі гісторыі!

Нічога не скажаш, цярністая дарога ў вячэрніка.

С. ЖЫЛЯК,
Н. ДАНІЛЕЎСКАЯ.

РЭХА ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА

БУДЗЕ БЕЛАРУСКАЯ ВУЛІЦА

Гараць ад мазоляў рукі, няшчадна паліць сонца. А тут Надзя Пастарнакевіч і Галіна Жадзько падганяюць:

— Раствор! Раствор!

Шчыра кажучы, спяшаюцца ўсе. Праз дзень, два атрад «Зубронак» павінен здаць чарговы дом.

У поўдзень сонца пячэ яшчэ больш нясцерпна. Усе вырашаюць пайсці на абед. Ці ўсе? Не, Слава Дашкевіч працягвае класці цагліну за цаглінай. Ён у нас прызнаны муляр. Ва ўсім атрадзе толькі ён адзін можа класці вуглы. Ды яшчэ як класці? Каб пасля абеду ў хлопцаў не было прастояў, Слава працаваў звышурочна. «Зубраняты» з павагай яго называлі галоўным інжынерам.

У стэпе, за пасёлкам, раскінуліся ўладанні Барыса Польнікава. На першы погляд яны не вельмі зайздросныя: некалькі глыбока ўзараных палосак зямлі, стагі саломы, ды зноў ажыўлены атрадным умельцам трактар. Тут вырабляецца саманная цэгла. Няма яе — стаіць будоўля. Вельмі цяжкі ўчастак. Таму і хлопцы падабраліся ў брыгаду па сіле. І не выпадкова ў саманнай брыгадзе «Зубронка» нарадзіўся новы рэкорд Уральскай вобласці — Ваня Белы і Толя Тарасевіч давялі выпрацоўку самана за змену да 800 штук на кожнага. З гэтага часу ўручаны нам камсамольцамі Мінскага аўтамабільнага завода пераходны вымпел — эмблема беларускага зубра — пастаянна прапісалася ў саманшчыкаў. Быў яшчэ ў атрадзе не менш важны ўчастак. Там працавалі Ала Мазгавая і Ліда Глаз, ім дапамагалі і іншыя дзяўчаты. Гаворка ідзе аб кухні. Так, вельмі горача даставалася кухарам, затое ўсе іх дзякавалі, усе былі задаволены іх працай.

Назаўсёды запамятаецца свята, якое мы правялі ў саўгасным клубе ў гонар гадавіны вызвалення Мінска ад фашысцкіх захопнікаў. Думаю, што і мясцовыя жыхары будуць яго таксама памятаць. Тады вельмі адзначылася агітбрыгада, якую ўзначальвала Валя Тхарова. Дарэчы, яна заняла першае месца на раённым аглядзе.

Цікавая дружба завязалася ў нас з казахскімі хлапчукамі і дзяўчынкамі, піянерамі з лагера «Спадарожнік». Разам з важатай Ларысай Краўчанка там завочнае падарожжа па гораду Мінску. У іх завязалася сяброўская перапіска з піянерамі Беларусі.

Бывалы цаліннік... Пазнаяце?..

яны праводзілі спартыўныя спаборніцтвы, арганізоўвалі цікавыя мерапрыемствы. Вельмі спадабалася рэбяты.

Незабыўнай старонкай нашага цаліннага жыцця застанецца сустрэча з Лаўрэатам Ленінскай і Нобеляўскай прэмій М. А. Шолахавым. Газета «Беларускі універсітэт» ужо расказвала аб гэтай сустрэчы, быў надрукаваны здымак. Мне хочацца ўсё ж такі яшчэ раз успомніць словы Міхаіла Аляксандравіча Шолахава аб Беларускай літаратуры: Беларусь дала чалавецтву геніяльнага паэта Янку Купалу. Шырока за межамі гэтай рэспублікі вядомы творы Пятруся Броўкі і іншых паэтаў і пісьменнікаў. Беларускай літаратуры ёсць чым ганарыцца.

...Мы ад'язджаем, пакідаючы казахскім братам плён сваёй працы. Гледзячы на залітыя сонцам белашыферныя дахі, нехта ўпэўнена прамовіў:

— Мы пабудуем тут яшчэ больш дамоў, школ. У казахстанскім стэпе вырасце вуліца Беларуская.

Ул. ФІЛАТАЎ,
член атрада «Зубронак».

УЗБЕКСКАЕ «РАХМАТ»

Наш беларускі атрад крыху спазніўся з прыездам у Ташкент. Тут мы ўжо засталі студэнтаў прыбалтыйскіх рэспублік, з Кішынёва, Масквы, Варонежа, Новасібірска і іншых гарадоў. «Старажылы» увялі нас у курс справы, дапамаглі размясціцца.

Наогул і мы вельмі хутка ўліліся ў дружную сям'ю будаўнікоў Ташкента, горада, які вытрымаў цяжкі экзамен, які мужна змагаўся за сваё права жыць і квітнець.

Нашаму атраду прышлося працаваць у двух мясцінах: частка людзей удзельнічала ў будаўніцтве трыццацішасцікватэрнага дома, рамантавала школы, дзіцячыя сады, а сорак шэсць чалавек склалі студэнцкую аўтакалону.

Ні днём, ні ноччу не спынялася праца. Па вуліцах Ташкента бясконца цягнуліся аўтамабілі, загружаныя будаўнічымі матэрыяламі. І сярод гэтага патоку можна было часта заўважыць нумарныя знакі на аўтасамазвалах, за рулём якіх сядзелі студэнты Уладзімір Малюкевіч, Мікалай Варакса, Уладзімір Грыгор'еў, Гена Усацюк і іншыя. Ніколі не забудуцца маршруты па вуліцах Навоі, праспекту Шота Руставелі, Камсамольскай плошчы, па Чыланзарскаму раёну... На працягу двух месяцаў на гэтых участках у дзве змены працавалі студэнцкія машыны.

У складаных умовах прышлося тады жыць і працаваць ташкентцам. Але нягледзячы на цяжкія выпрабаванні, трывожныя дні і ночы, яны, як і былі, засталіся гасціннымі. Мы часта сустракаліся са сваімі ўзбекскімі братамі, наведалі дзіцячыя сады і піянерскія лагеры і ўсюды чулі стаўшае такім знаёмым і блізкім «рахмат», «дзякуй». Дакладней кажучы, сардэчную падзяку за матэрыяльную і маральную падтрымку ташкентцы вымаўлялі на розных мовах. Ташкент — па-сапраўднаму інтэрнацыянальны горад, а цяпер ён стаў яшчэ больш многамоўным. Уся краіна праяўляе вялікія клопаты аб узраджэнні сталіцы сонечнага Узбекістана.

І. АСКІРКА.

ТАМ, ДЗЕ ШУМЯЦЬ ТАЁЖНЫЯ КЕДРЫ

Імклівы ІЛ-18, рассякаючы воблачны занавес, зноў апынуўся ў моры сонца. Вышыня — восем тысяч метраў! Не верыцца, што некалькі мінут назад пацелі ад жары, а тут, паведамляе сцюардэса, ужо 39 градусаў марозу. Хлопцы стоўпіліся каля ілюмінатараў — прыгажэйшая карціна, воблакі, нібы наносы снегу ў Арктыцы. Навокал — адна белізна. Хлопцы насцярожаныя, сур'ёзныя. Відаць, хвалююцца — наперадзе многа невядомага.

— А здорава ўсё ж будзе праехаць па Енісею на кацеры, — нібы сам сабе гаворыць Вася Герасімаў.

— Або пайсці на мядзведзя!— прыплюшчыў вочы Коля Барысенка.

— А калі наадварот! — рассмяяўся Хацяшоў.

Хутка ў размовах праляцелі гадзіны.

— Глядзіце, глядзіце! — хлопцы зноў кінуліся да ілюмінатара. Паволі хістаючы крыламі, самалёт пачаў зніжацца. Унізе, у зялёным тайнзлі тайгі, велічна імчаў Енісей...

Нас сустрэў начальнік рэйда сплаўбазы П. Р. Якунін. Петр Рыгоравіч працуе на Енісеі больш трыццаці год. Быў сплаўшчыкам, ганяў плыты, стаў майстрам, пасля начальнікам рэйда. Чалавек сціплы і просты, аб сабе не любіць расказваць. Рукі і твар — у рубцах: гэта вайна пакінула след, гэта мядзведзь «пажартаваў», а гэта з браканьерамі справа была, стралялі гады... Нядаўна за поспехі Пётр Рыгоравіч быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцягу.

— Васіль, — крычыць Якунін невысокаму мужчыне ў шырокай кепцы, — гасцей прымай!

Так, аб'ект працы вызначан. Размяркоўваюцца абавязкі: Коссця Хацяшоў, Яша Макарэвіч і Віктар Турко—брыгадзіры сплаўшчыкаў. Валодзя Цішко «заваладаў» партфелем брыгадзіра такелажнікаў, Мікалай Гоцін і Іван Гуланаў застаюцца на беразе з камандамі. Валя Вакар, Жана Мітчанка і Тамара Смагіна ўжо брамчаць пасудай, іх задачы даўно высвятлены.

Ітак, пасля абеда ўсе павінны быць дома, у школе, дзе размяшціўся атрад. У ленпакоі інжынер Ніна Віктараўна Баярчук рыхтуецца да гутаркі аб тэхніцы бяспекі.

А цяпер пара. Дзесці стыне ўжо густы тлусты боршч. Відаць, кухары нервуюцца ў чаканні атрада. Хлопцы трохі важнічаюць. Яшчэ б — сплаўшчыкі! Нават у машыны ўзбіраюцца з лянотай, хоць даўно жываты падцягнула. Камісар Сяргей Шыкаў правярае па спісу: у зборы ўсе сорак чатыры чалавекі. Машына кранулася. Нехта адразу пачынае песню, яе тут жа падхопліваюць:

...Мы на лесосплаве
не стремимся к славе,
У студентов помыслы просты—
Пусть бывает жарко, поплывут
в Игарку
Жёлтыми конвертами плоты...

Уецца за машынай песенька Лёні Дайнекі. Нарадзілася яна тут жа, на беразе Енісея.

З гэтай песняй кожную раніцу мы накіроўваліся на працу. Сустракалі і праводзілі плыты, выкочвалі бярвенні на бераг, грузілі вагоны. Як кажуць, шмат драўніны прышлося прапусціць праз свае рукі. Затое, з якой вялікай радасцю мы даведаліся аб тым, што ўдарныя камсамольскія будоўлі ў Казахстане датэрмінова атрымалі грузы з лесам. Гэта найлепшая адзнака нашай працы.

В. СІНІЦА,
камандзір Краснаярскага атрада «Пяканка».

ВЫСОКАЕ МАЙСТЭРСТВА І ПРЫГАЖОСЦЬ

На працягу некалькіх дзён ва універсітэце праводзіўся агляд—конкурс самадзейных мастацкіх калектываў, прысвечаны 50-годдзю Савецкай улады. Гэта была своеасаблівая падрыхтоўка да юбілейнага Усесаюзнага фестывалю. Як і чакалася, факультэты прадставілі рознастайныя цікавыя нумары, парадавалі журы конкурса і гледачоў высокім майстэрствам самадзейных артыстаў. Наперадзе заключны канцэрт, удзел у раённым аглядзе, а, магчыма, і ва Усесаюзным фестывалі.

НА ЗДЫМКАХ: выступленні танцораў гістарычнага факультэта.

Фота *А. Кадзета.*

Рэдактар М. І. ІОСЬКА.

АТ 00582 Адрас рэдакцыі: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, І паверх, п. 108, тэл. Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. № 1660.